Источник: "Настаўніцкая газета" - 2017-04-22

**Надоечы ў Мінску адбылося чарговае пасяджэнне аналітычнай групы Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Белая Русь". Тэму дыскусіі, у якой прынялі ўдзел беларускія парламентарыі, прадстаўнікі навуковай і творчай супольнасці нашай краіны, аспіранты і студэнты, у тым ліку будучыя кіраўнікі на дзяржаўнай службе, вызначылі актуальныя сёння пытанні моўнай культуры.**

# Мова як ДНК

Адкрываючы форум, старшыня РГА "Белая Русь" Аляксандр Радзькоў нагадаў прысутным, што раней спецыяльна запрошанымі гасцямі на пасяджэннях аналітычнай групы гэтай арганізацыі былі такія цікавыя і кампетэнтныя ў сваіх прафесійных сферах асобы, як доктар філасофскіх навук, прафесар, першы прарэктар Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А.Куляшова Міхаіл Вішнеўскі, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Валерый Варанецкі і інш. І кожны раз такія сустрэчы прыносілі рэальны плён у выглядзе нетрывіяльных, супольна народжаных ідэй і інтэнцый.

Гэтым разам выступіць перад удзельнікамі аналітычнай групы РГА "Белая Русь" запрасілі вядомага мовазнаўца, доктара філалагічных навук, прафесара, загадчыка кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі БДУ Віктара Іўчанкава. Тэма яго лекцыі была азначана як "Моўны імідж кіраўніка", а на мультымедыйным экране ў аналітычным цэнтры РГА "Белая Русь" была прапісана ўстановачная аксіёма дыскусіі: "У сучасным свеце ўсё большую значнасць набывае культура зносін. Правільнае і дарэчнае слова можа выступіць у ролі партнёрскага поціску рукі, функцыя якога — выклікаць прыхільнасць да сябе з боку суразмоўцы, надаць гутарцы паважлівы тон, знайсці творчы імпульс узаемаразумення і згоды".

Закранаючы праблему моўнай культуры асоб, якія займаюць кіраўнічыя пасады, прафесар агучыў умоўную славесную мадэль-клішэ, якая можа гучаць прыблізна так: "На сённяшні дзень патэнцыяльныя магчымасці перспектыў развіцця эканомікі залежаць ад спецыфічных асаблівасцей яе функцыянавання". У гэтым сказе, здавалася б, навідавоку ўся яго бязглуздзіца і нязграбнасць з перанасычанасцю бессэнсоўных таўталогій ("патэнцыяльныя магчымасці", "перспектывы развіцця", "спецыфічныя асаблівасці"), але, на жаль, менавіта такія моўныя звароты можна сёння часта пачуць з вуснаў адказных асоб. Дарэчы, Віктар Іўчанкаў прывёў яшчэ мноства пашыраных таўталагічных выразаў, якімі засмечана мова нашых кіраўнікоў, чыноўнікаў дый наогул вельмі многіх людзей: "лідзіраваць наперадзе", "дадатковы бонус", "кароткі міг", "калега па працы", "асабіста я", "інтэрактыўнае ўзаемадзеянне", "іншая альтэрнатыва", "народны фальклор", "маршрут руху", "саміт на вышэйшым узроўні", "месяц май", "друкаваная прэса", "асноўны лейтматыў", "селекцыйны адбор", "папярэджваць загадзя", "вядучы лідар", "букет кветак", "гераічны подзвіг", "галоўны фаварыт", "мае месца быць", "IT-тэхналогіі", "CD-дыск", "VIP-персона" і інш. "Насамрэч, усё гэта — так званая птушыная мова, або, як прынята гаварыць у лінгвістыцы, гласалалія. Да гласалаліі як стылістычнага прыёму часам знарок звяртаюцца пісьменнікі і паэты, напрыклад, футурысты пачатку XX стагоддзя. Нярэдка гласалалія сустракаецца ў прамовах вопытных рэлігійных маніпулятараў, якія з дапамогай яе могуць даводзіць людзей да трансу. Але відавочна, што гэта зусім непрымальная з'ява ў мове кіраўнікоў, грамадскіх дзеячаў", — падкрэсліў Віктар Іўчанкаў. Каб слухачы маглі выразна адрозніць, дзе гласалалія, а дзе асэнсаваная ўдумлівая мова, ён працытаваў кароткі ўрывак з колішняга выступлення старшыні РГА "Белая Русь" Аляксандра Радзькова на афіцыйным пасяджэнні па лініі ЮНЕСКА: "Інтэлект нацыі з'яўляецца вырашальным фактарам у канкурэнтнай барацьбе, які вызначае месца і перспектывы той ці іншай краіны ў сучасным свеце". "Тут няма ніякіх "на сённяшні дзень", "перспектыў развіцця", "актуальных праблем" і да т.п. Тут усё па справе, усё лагічна і зразумела", — пракаментаваў прафесар.

У сваім выступленні Віктар Іўчанкаў спыніўся яшчэ на многіх аспектах нашай моўнай рэальнасці. Напрыклад, ён звярнуў асаблівую ўвагу на тыя адносна новыя моўныя з'явы, якія з'явіліся з узнікненнем інтэрнэту і пашырэннем інфармацыйных тэхналогій, што ў свой час прымусіла вядомага расійскага прафесара Максіма Крангаўза напісаць кнігу "Руская мова на мяжы нервовага зрыву". У сувязі з гэтым наш прафесар заўважыў, што за апошнія дзесяцігоддзі ў мове адбыліся сістэмныя змены, найперш тое, што да дзвюх яе форм, вуснай і пісьмовай, дадалася трэцяя — мова інтэрнэту, своеасаблівы сімбіёз першай і другой. "Заўважце, заўзятыя карыстальнікі сацыяльных сетак ці не штодня мяняюць там свой статус, каб звярнуць на сябе ўвагу, рэалізаваць сябе. А значыць, для гэтага ім трэба або самім прыдумляць нейкае выказванне, або знаходзіць яго ў Шэкспіра ці іншага генія, — адзначыў Віктар Іванавіч. — Сёння мы, асабліва маладыя людзі, як ніколі да гэтага за ўсю гісторыю чалавецтва, пагружаны ў тэкст. І няпраўда, што чалавек сёння не чытае. Ён ніколі яшчэ не чытаў столькі, колькі чытае сёння. Бяда ў тым, што чытае найчасцей не тое і не так, як трэба".

У поле зроку Віктара Іўчанкава таксама трапілі такія вострыя моманты моўнага быцця ў розных сферах, як так званая лінгвістыка хлусні, паліткарэктнасць у СМІ (калі рэчы папросту называюцца не сваімі імёнамі і адны паняцці падмяняюцца іншымі), маніпуляцыі з падачай інфармацыі ў медыя (калі на некаторых парталах і тэлеканалах наўмысна акцэнтуецца негатыў), тэндэнцыя да спрашчэння мовы ("Але ж спрашчаецца толькі форма, а мова, наадварот, узбагачаецца!"), адкрытая вербальная агрэсія ў прэсе і электронных СМІ ("Але трэба памятаць: калі ўзнікае вербальная агрэсія, яна абавязкова перарасце ў агрэсію фізічную!") і інш.

"Мы ўсе хадзячыя тэксты. А наша мова як інструмент самавыражэння і нават самападачы асобы па сутнасці з'яўляецца нашым своеасаблівым ДНК ці адбіткам накшталт адбітка пальца. Гэты тэкставы адбітак, як і адбітак пальца, таксама непаўторны. Колькі існуе чалавецтва, яшчэ ніхто не паўтарыўся. Тое, як мы думаем, што мы гаворым (на працы, дома, на вуліцы), — гэта ўсё тэкст. І да гэтага трэба ставіцца вельмі беражліва, з усёй адказнасцю", — падсумаваў Віктар Іўчанкаў.

Напрыканцы пасяджэння экспертнай групы РГА "Белая Русь" Аляксандр Радзькоў падзяліўся некаторымі нюансамі з уласнага досведу выступленняў перад рознымі тыпамі аўдыторыі. Так, ён заўважыў, што заўсёды імкнуўся спачатку абазначыць планку, каб яе маглі адчуць слухачы і як бы стаць на адзін узровень з выступоўцам, каб яны маглі потым як роўныя паспрачацца са спікерам, адэкватна сфармуляваць пытанні. Таксама вельмі важна ўлічваць спецыфіку кантынгенту, перад якім выступае кіраўнік. Аляксандр Міхайлавіч успомніў, як не цураўся такіх слэнгавых маладзёжных слоў, як, напрыклад, "туса", калі яму даводзілася гутарыць са старшакласнікамі і студэнтамі: "Такія словы трэба гаварыць акуратна, дарэчы. Але гэта будзе сігналам таго, што вы свой". І, безумоўна, неабходна заўсёды, пры кожнай сустрэчы са сваімі слухачамі, знаходзіць нестандартны падыход да канкрэтнай тэмы. Аляксандр Міхайлавіч згадаў, як у бытнасць міністрам адукацыі яму давялося выступаць на нейкім вельмі адказным пасяджэнні ў Мінгарвыканкаме. "Калі б я тады пачаў сваё выступленне з фразы накшталт "На сённяшні дзень сістэма адукацыі краіны сутыкаецца з такімі вострымі праблемамі, як..." і пачаў пералічваць гэтыя праблемы, аўдыторыя адразу пачала б займацца сваімі справамі, начыста забыўшы пра мяне. А я зрабіў інакш. Пачаў расказваць ім пра старажытных егіпцян, пра тое, як яны аднойчы зразумелі, што ўсё — і жыццё, і смерць, і дабрабыт — залежыць ад іх галоўнага бажаства — Сонца. Пра тое, як яны вынайшлі сонечныя цыклы, спачатку — сутачны цыкл, потым — гадавы. Пра тое, што шукалі і трэці цыкл, але адчувалі, што для гэтага ім патрэбны магутныя інструменты, і пачалі будаваць свае гігантскія піраміды... Сёння, дарэчы, мы ведаем, што гэты трэці цыкл на самай справе існуе. Гэта абарачэнне Сонечнай сістэмы вакол цэнтра галактыкі, уваходжанне яе ў нейкія палі, скачкі, флуктуацыя і г.д. Старажытныя егіпцяне канчаткова трэці цыкл так і не знайшлі, але ж яны шукалі яго! І ім была пільна неабходна дапамога ў гэтых пошуках. І тады я зусім нечакана для прысутных заявіў: "І гарвыканкам таксама сёння павінен дапамагчы сістэме адукацыі!" — адзначыў Аляксандр Радзькоў, чым выклікаў у сяброў аналітычнай групы "Белай Русі" захапленне, бадай, не меншае, чым некалі ў чыноўнікаў з Мінгарвыканкама.

"Я да чаго гэта ўсё кажу? — заключыў Аляксандр Міхайлавіч. — А да таго, што трэба настойліва авалодваць ведамі, авалодваць мовай. Вы ж будучыя палітыкі, дэпутаты, кіраўнікі на розных узроўнях. Вам развіваць краіну. Калі вы не будзеце пераканаўчымі, вы не прыцягнеце людзей да сябе, не зацікавіце іх".

**Мікола ЧЭМЕР.**

**P.S.** У планах аналітычнай групы РГА "Белая Русь" — запрасіць на свае пасяджэнні першага народнага настаўніка Беларусі выкладчыка фізікі Магілёўскага абласнога ліцэя № 1 Валерыя Барашкова, пасла Рэспублікі Беларусь у Японіі Сяргея Рахманава, вядомага пісьменніка, літаратуразнаўца, публіцыста, намесніка міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Алеся Карлюкевіча, кіраўніка Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі старшыню Рэспубліканскай тапанімічнай камісіі пры НАН Беларусі Ігара Капылова.

Мікола Чэмер. Мова як ДНК